# Тэма:

Сінтаксічныя прыметы сказаў са звароткамі: ужыванне, знакі прыпынку.

# Мэты ўрока:

- паглыбіць веды пра зваротак;
- садзейнічаць выпрацоўцы ўменне вызначаць сказы са звароткам, характарызаваць іх паводле спосабу выражэння, структуры, ужывання;
- правільна інтанаваць сказы са звароткам,ставіць знакі прыпынку;
- ствараць умовы для выхавання, любові і павагі да людзей.

## *Эпіграф*

**Дзе Дняпро-чараўнік між крутых берагоў**

**Ціха коціць празрыстыя воды,**

**Ты стаіш, Магілёў, горды мой працаўнік,**

**Горад шоўку, садоў і заводаў.**

**А.Хліманкоў**

Спішыце сказы. Знайдзіце звароткі.

I варыянт

1. Ляці ж наша песня ад вёскі да вёскі.
2. Дзень добры гаспадыня восень!
3. Ноч не шумі ты асокамі ціхім усплескам балот.
4. Восень прайшла пералескамі.
5. Спявай, гучы, красуй.

II варыянта

1. Моладзь гуляла па праспекту.
2. Чаго ж ты каліна сёння так нявесела?
3. Дзень добры вам лясы і гоні!
4. Восень апранула дрэвы ў рознакаляровую вопратку.
5. Пралятайце гады залатымі агнямі!

Адказы

I варыянт

1. Ляці ж *,наша песня,* ад вёскі да вёскі.
2. Дзень добры, *гаспадыня восень!*
3. *Ноч,* не шумі ты асокамі, ціхім усплескам балот.
4. Восень прайшла пералескамі.
5. Спявай, гучы, красуй.

II варыянт

1. Моладзь гуляла па праспекту.
2. Чаго ж ты *,каліна,*сёння так нявесела?
3. Дзень добры вам, *лясы і гоні!*
4. Восень апранула дрэвы ў рознакаляровую вопратку.
5. Пралятайце,*гады*, залатымі агнямі!

*Зваротак* – *гэта слова або словазлучэнне, што абазначае асобу ці прадмет, да якіх звяртаюцца з мовай, заклікам, просьбай, якім наогул адрасавана выказванне.*

## II раздзел “Згубіўся знак”

## Растастаўце знакі прыпынку і растлумачце.

### I варыянт

1. Пакружыся бусел нізка над вярбою.
2. Што ты плачаш кнігаўка?
3. Любая ты засланіла свет.
4. Эй ты чаму не едзеш?

### II варыянт

1. Трэба Ваня пагаварыць сур’ёзна.
2. Багата родная ты мова цябе стварыў і ўзнёс народ.
3. Эй Валодзя цяжкавата мне.
4. Хмаркі залатыя  Вы – прастору дзеці…

Адказы.

I варыянт

1.Пакружыся, ***бусел,*** нізка над вярбою. (назоўнік у Н.скл.)

2.Што ты плачаш, ***кнігаўка***? 1. (назоўнік у Н.скл.)

3.***Любая***,ты засланіла свет.(прыметнік)

4.Эй,***ты,***чаму не едзеш? (асабовы займеннік)

II варыянт

5.Трэба,***Ваня,***пагаварыць сур’ёзна. (назоўнік у Н.скл.)

6.Багата, ***родная ты мова***, цябе стварыў і ўзнёс народ. (развіты зваротак)

7.Эй,***Валодзя***,цяжкавата мне. (назоўнік у Н.скл.)

8. ***Хмаркі залатыя!*** Вы – прастору дзеці…. (развіты зваротак).

О край мілы!Усёй душой хачу злучыцца я з табою.
О край родны край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Дзед а дзед!Зрабі мне свісток.

О край мілы! Усёй душой хачу злучыцца я з табою. (часціцы ад звароткаў не аддзяляюцца коскамі)

О, край родны, край прыгожы! Мілы кут маіх дзядоў! (калі **часціца о** ўжываецца ў ролі выклічнікаў, то аддзяляецца ад зваротка коскай.)

Дзед, а дзед! Зрабі мне свісток.

(калі зваротак паўтараецца і мае пры сабе **часціцу а** , то коска ставіцца перад часціцай.)



III Раздзел “Раскажы мне пра будову…” . Даць характарыстыку сказаў.

Магілёўшчына – маляўнічы прыдняпроўскі край. Край, які здаўна багаты і прыродай сваёй, і гісторыяй, і людзьмі. Мая Радзіма! Мая любоў!

## III Раздзел “Раскажы мне пра будову…” . Даць характарыстыку сказаў.

Магілёўшчына – маляўнічы прыдняпроўскі край. ( апавядальны, просты, няклічны, двухсастаўны, развіты.)

Край, які здаўна багаты і прыродай сваёй, і гісторыяй, і людзьмі. (Складаназалежны: 1сказ – край- апавядальны, просты, няклічны, аднасастаўны, неразвіты, назышны; 2 сказ - апавядальны, просты, няклічны, двухсастаўны, развіты, поўны, ускладнены аднароднымі дапаўненнямі.)

Мая Радзіма! Мая любоў! (апавядальны, просты, клічны, развіты.)



3)Прыём “Карэспандэнты”

Скласці зварот да роднага горада, выкарыстоўваючысвае асацыяцыі. (5-6 сказаў)



Адказы

Варыянт 1: 1 – б; 2 – а, г, д; 3 – А: мастацкага, Б: увасабленне;
4 – а, б; 5 – 1, 3, 4, 7, 8.

Варыянт ІІ: 1 – а, г; 2 – а, б, г; 3 – А: мастацкага, Б: увасабленне;
4 – а, в, д; 5 – 1, 5, 7, 8.

Дамашняе заданне:

1)Выпісаць 10 сказаў са звароткамі з аповесці В.Быкава “Сотнікаў”;

2) с.118-119, правіла пр.135.

3) Сачыненне-мініяцюра “Мой Магілёў”

Прыём “Аргументацыі”: ( напісаць свае ўражанні аб уроку і працы на ім.)

гэты ўрок …

на ўроку я працавала…, таму што…;

сваёй работай на ўроку я ….;

урок мне спадабаўся….

# Дзякуй за ўвагу!

